Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

Загад рэктара БДПУ
№1094 лс ад 10.10.12

Факультэт эстэтычнай адукацыі
Кафедра тэорыі і методыкі выкладання мастацтва

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# «АТРЫБУТЫ І СІМВАЛЫ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ЖЫВАПІСЕ БЕЛАРУСКІХ МАСТАКОЎ XIX — ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯЎ»

Дыпломная работа
па «Сусветнай і айчыннай культуры, фальклору і методыках іх выкладання»

студэнткі 4 курса, 45 групы
Сыс Ангеліны Генадзьеўны
Навуковы кіраўнік:
Захарына Ю. Ю.
кандыдат мастацтвазнаўства,
дацэнт

Мінск 2013

# УВОДЗІНЫ

*"Як кожны народ мае сваю нацыянальную душу, так ён мае і свой асаблівы склад (стыль) творчасці, найбольш прыдатны да гэтай душы. Ёсць ён і ў нас, беларусаў, і мы мусіма звярнуцца да яго, каб улажыць што-небудзь сваё ў скарбніцу светавой культуры, каб уліць у нашую паэзію свежыя сокі, каб стаць бліжэй да душы роднага народа, лепі паталіць яе духоўную смагу і запраўды ўзяцца за вялікую працу: развіццё беларускай народнай культуры".*

*Максім Багдановіч.*

Народная культура любой краіны з'яўляецца найкаштоўнейшым фундаментам для фарміравання высокапрафесійнага мастацтва. Яна, з сівой старажытнасці нясе сімвалізм у розных праявах: матэрыяльнай і духоўнай спадчыне, надзённым і адвечным. Яна выступае скарбніцай натхнення для сучасных творцаў мастацтва: харэографаў, дызайнераў, пісьменнікаў, кулінараў і інш.

Беларуская народная культура адметна сваімі праявамі: фальклорам (на грунце беларускага фальклора стваралі свае апавяданні выдатныя пісьменнікі: Максім Багдановіч, Янка Купала, Якуб Колас, Александр Пушкін і г.д.), рушнікамі і слуцкімі паясамі (яны натхняюць сусветна вядомых дызайнераў), стравамі (яны заўсёды папулярны сярод кулінараў свету). Адной з праяў народнай культуры з'яўляецца яе асаблівая сімволіка, што замацоўваецца ў творах з дапамогай розных народных атрыбутаў: арнамента, адзення, рушнікоў, посцілак, рэчаў хатняга ўжытку – усе яны маюць семантычнае значэнне.

Выяўленне сімвалаў беларускай культуры ў дэкаратыўным мастацтве народа мае вялікі інфармацыйны патэнцыял. Вывучэнне гэтых старажытных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

атрыбутаў дапамагае разуменню тых гістарычных эпох, аб якіх няма пісьмовых дадзеных і магчыма судзіць толькі па дайшоўшых да нас матэрыяльных рэштках [9].

Аднак, тэма выяўлення мастакамі сімвалаў народнай культуры не значна даследавана, хаця і мае навуковы патэнцыял, бо дапамагае больш глыбей вывучаць дзейнасць беларускіх мастакоў.

***Мэта дыпломнай работы*** — раскрыццё адметнасцей выяўлення атрыбутаў і сімвалаў народнай культуры ў жывапісе беларускіх мастакоў XIX — пачатку XXI стагоддзя, вызначэнне іх ролі, актуальнасці на розных гістарычных этапах.

***Задачы***:

- прааналізаваць жывапіс беларускіх мастакоў XIX — пачатку XXI стагоддзя, адзначыць ролю народных атрыбутаў і сімвалаў ў ім;
- правесці параўнальную характарыстыку выяўлення нацыянальнай беларускай сімволікі ў розных жанрах мастацтва;
- вызначыць актуальнасць выяўлення народнай сімволікі ў беларускім мастацтве XIX — пачатку XXI стагоддзя.

***Аб'ект даследавання***: жывапісныя творы беларускіх мастакоў XIX — пачатку XXI стагоддзя.

***Прадмет даследавання***: спецыфіка выкарыстання народнай сімвоікі ў жывапісе беларускіх мастакоў XIX — пачатку XXI стагоддзя.

***Метады даследавання***:

- мастацтвазнаўчы аналіз твораў беларускіх мастакоў XIX — пачатку XXI стагоддзя;
- сістэмна-структурны метад;
- параўнальна-гістарычны метад.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ